# Жанчыны ў літаратурным працэсе: пакліканне і крыж



Ва Украіне і на Беларусі адзначаецца 150-годдзе з дня нараджэння Лесі Украінкі шматлікімі выставамі, круглымі сталамі і пісьменніцкімі сустрэчамі, у якіх удзельнічае пасольства Украіны.

Леся Украінка (Ларыса Пятроўка Косач - Квітка, 1871-1913) - паэтка, пісьменніца, перакладчыца і культурная дзеячка, удзельніца нацыянальнага руху. Яна пісала ў самых разнастайных жанрах: паэзіі, лірыцы, эпасе, драме, прозе, публіцыстыцы, а таксама - у галіне фалькларыстыкі.

*"Яе асоба важная для беларускай культуры. Пры яе жыцці на Беларусі ведалі яе. Творы Лесі Украінкі перакладзены на дзясяткі моў свету.*

*Леся Украінка змагла творчасцю дайсці да вышыняў духу, яна ўзбагаціла строфіку, метрыку, рытміку ўкраінскай паэзіі, выкрыстоўвала катрэны і актавы, гекзаметр, верлібр, пяцістопавы ямб і іншыя памеры, стаяла ў авангардзе творчых сіл, якія выводзілі ўкраінскую літаратуру на новы сусветны ўзровень.*

*У час хваробы Леся Украінка вывучыла 10 моваў, яна была вельмі адукаваным чалавекам, усе веды змагла раскрыць у творчасці, у тым ліку веданне біблейскай тэматыкі. Адна з яе ключавых тэмаў - тэма свабоды.*

*"Лісова пісьня" - вяршыня драматычнай творчасці пісьменніцы"*, - адзначыла магістр філалагічных навук Алена Бармоціна, удзельніца круглага стала, прысвечанага творчасці пісьменніцы, які прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

*"Драма-феерыя "Лясная песня" - чароўны квяцісты востраў у творчасці Украінкі"*, - пісаў Максім Рыльскі. *"Гэта вялікая паэма жыцця лясной і вадзяной зямлі, філасофскае абагульненне ўсяго светлага"*, - лічыў У. Караткевіч.

Леся Украінка разглядала прыроду як больш гарманізаваны свет. Старонкі кахання - вяршыня гімну самаму найтонкаму адчуванню душы. Л. Украінка перакновае, што нараджаць мастацтва можа толькі чыстая душа.

Творчасць Лесі Украінкі, інтэлегентная, вытанчаная, маральная будзіць у душах самае светлае. Фізічна кволая жанчына зрабіла подзвіг, знайшла сродкі і арганізавала фальклорную экспедыцыю, дзе сабрала песні Палтаўшчыны.

Нягледзячы на тое, што яна пражыла кароткае і трагічнае жыццё, ва Украіне падрыхтаваны 14-томны збор яе твораў.

Часта ў літаратурнай крытыцы гучаць параўнанні Лесі Украінкі з Максімам Багдановічам. Абодва творцы звярталіся да еўрапейскіх міфалагічных тэм.

Юбілей Лесі Украінкі мае важнае значэнне ў кантэксце беларуска-украінскіх дачыненняў.

**Э. Оліна.**